# САМАТЫЧНЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ Ў АПАВЯДАННЯХ М. ЛЫНЬКОВА

***Кудзін М.А.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *Л.М. Мазуркевіч, канд. філал. навук, дацэнт*

Дасціпнасць, непаўторны аўтарскі гумар, глыбокае разуменне ўнутранага свету сваіх герояў, арыгінальнае ўжыванне моўных сродкаў – гэта толькі некаторыя вызначальныя рысы лынькоўскага стылю. “Лынькоў па-майстэрску выкарыстоўваў лексіку і фразеалогію беларускай мовы, выяўленчыя магчымасці марфалогіі і сінтаксісу” [1, с. 323]. Сярод фразеалагізмаў, зафіксаваных у мове апавяданняў М. Лынькова, найбольшую колькасць паводле тэматычнага паказчыка апорнага кампанента складаюць устойлівыя спалучэнні, у састаў якіх уваходзяць словы, што называюць часткі і органы цела чалавека. Такія лексемы ў фразеалогіі абазначаны тэрмінам *саматызмы*, а фразеалагізмы з кампанентамі-саматызмамі – *саматычныя фразеалагізмы*: *А калі заварушацца шэраю купінай нудныя клопаты, калі чорныя думкі апануюць розум і* ***на сэрца наляжа камень*** *шызага суму, – бяжы тады, чалавеча…* [2, с. 92]; *На тое і субота, каб адпачыць, пагуляць, з суседзямі аб жыцці пагаварыць, аб справах мазольных параіцца і, вядома, трохі* ***языкі пачасаць*** *пра блізкіх і далёкіх* [2, с. 31]; *Што было ў дні юнацтва і маладосці, –* ***як на далоні*** *стаіць, а вось што пяць ці шэсць год назад – імглою, туманам пакрылася* [2, с. 38]; *Яна асцярожна налівае з гладыша ў шклянку шэрае, рэдкае цеста, падносіць блізка да вока, прыглядаецца, але* ***не верыць сваім вачам****, надзявае другія вочы – такія ж старыя, як сама, акуляры і доўга налівае, адлівае, перамервае…* [2, с. 103]; *Расказвала пра краўца Лёву, які сядзіць над іголкай ад усходу да захаду сонца, а жонка яго – гультай адвечны –* ***палец аб палец не стукне****, выкручвае носам перад люстэркам ды цэлы дзень распявае...* [2, с. 28]; *Ну, што, што вам трэба і чаго вы* ***раты паразяўлялі****?* [2, с. 110]; *Тут і мокрыя, прэлыя анучы, і востры дзёгаць, і ўедлівая махра, і яшчэ больш уедлівы, захрасаючы* ***колам у горле*** *тытунь-самасей* [2, с. 177]; ***Усміхаецца*** *аж* ***да вушэй****, чырванее твар яго…* [2, с. 110].

Такім чынам, саматычныя фразеалагізмы выступаюць як адметны моўны сродак, з дапамогай якога перадаецца не толькі цэлая гама пачуццяў, але і сутнасць чалавечых характараў.

**Літаратура**

1. Рагаўцоў, В.І. Лынькоў Міхась Ціханавіч / В.І. Рагаўцоў // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 322–324.
2. Лынькоў, М. Апавяданні / М. Лынькоў // Зб. тв.: у 8 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – Т. 1. – 622 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина